# НАРОДУ СВАЙМУ НА ЎСПАМІН

*А сёння я была ў бібліятэцы…*

З гэтага радка пачынаецца адзін з маіх вершаў, які я прысвяціла бібліятэцы, дзе калісьці працавала, а сёння з яго пачну аповяд пра бібліятэку, з якой знаёмая не адзін дзясятак гадоў.

Маё дзяцінства і юнацтва прайшлі на Капыльшчыне. Калі пераехалі сюды з бацькамі, я пайшла ў пяты клас. Жылі мы ў вёсцы, і таму дабрацца дадому адразу пасля ўрокаў атрымлівалася не заўсёды. Калі паспявала на аўтобус, які ішоў у абед, а калі і не. Куды было дзявацца? Ішла ў гарадскую бібліятэку і знаходзілася там да самага вечара. Заняцца было чым: рабіла ўрокі, чытала кнігі, а яшчэ гартала падшыўкі часопісаў па рукадзеллі. У школьныя гады вельмі любіла вязаць спіцамі, але для вязання патрэбныя былі схемы, таму я перамалёўвала сабе ў сшытак розныя ўзоры. Так адбывалася амаль кожны дзень. З цягам часу ўтульная чытальная зала стала мне другім домам і тым куточкам, наведаць які было востра неабходна. Калі скончыла школу, – паехала вучыцца ў Навагрудак, а пасля выйшла замуж і пераехала жыць у Гродна. З таго моманту ў бібліятэку я не заходзіла, але, наведваючы Капыль, заўсёды вітала яе шчырым сяброўскім поглядам і цёплай усмешкай.

У гэтым годзе, падчас збораў у водпуск да бацькоў мне ў галаву прыйшла ідэя: чаму б не выступіць у бібліятэцы, дзе, магчыма, і ўзяў свой пачатак мой творчы шлях? Я напісала пісьмо загадчыцы бібліятэкі і прапанавала арганізаваць сустрэчу. На наступны дзень яна па тэлефоне адказала:“Мы толькі за!”. Гэты адказ настолькі абрадаваў мяне, што я ўжо чакала не водпуску, а таго запаветнага дня, калі пераступлю парог дарагога мне будынка. Дзень за днём, гадзіна за гадзінай – і вось нарэшце надыйшоў той самы жаданы момант. Хвалявалася я моцна. І не таму, што трэба выступаць, а таму, што слухаць мяне будуць сцены, якія былі для майго дзяцінства пяшчотнымі крыламі, а глядзець на мяне будуць кнігі, на старонках якіх жывуць бессмяротныя класікі беларускай літаратуры. Гэта не толькі вялікая павага, але і адказнасць.

На сустрэчу я пайшла разам са сваімі дзеткамі. Яны не маглі не падтрымаць матулю, а мне вельмі хацелася, каб яны прайшліся па сцяжынках маёй мінуўшчыны. Сустрэлі нас з цеплынёй.

Правялі ў чытальную залу і прапанавалі крышку аглядзецца. Зала, канешне, стала ўжо зусім іншай: новая мэбля, іншае размяшчэнне… Але мне здавалася, што я бачу ўсё тое ж ўтульнае памяшканне з дзіцячых гадоў, адчуваю ўсё той жа пах пажоўклых падшывак і старэнькіх кніг. І гэта цудоўна. Мой настрой адразу расфарбаваўся ва ўсе колеры вясёлкі, і на сэрцы стала так спакойна, як бывае толькі пры сустрэчы з чымсьці вельмі блізкім.

Мерапрыемства прайшло, як кажуць, на адным дыханні. Гучалі вершы пра Радзіму, пра бацькоў і, канешне, пра Вялікую Перамогу. А як жа без яе, тым больш, што Анатоль Астрэйка, імя якога носіць бібліятэка, быў удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і разам з усімі змагаўся за мір на нашай зямлі. Яго партрэт, які вісіць на ўваходзе ў чытальную залу, выпраменьвае столькі чароўнага святла, што не адчуць яго проста немагчыма. А яшчэ, ведаеце, для мяне стала вялікім адкрыццём, што Анатоль Астрэйка з 1946 па 1948 гады працаваў кіраўніком Гродзенскага аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР. Зараз адчуваю бязмежны гонар, што працую вядучым спецыялістам у Гродзенскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі. І мяркую, што нітачка, якая звязвае мяне з Капылём намнога мацнейшая, чым я сабе ўяўляла. Гэтая выснова стала падставай для таго, каб задумацца і, мажліва, глыбей даследаваць жыццёвыя шляхі пісьменнікаў, родныя мясціны якіх прыцягнулі мяне ў свой час да сябе.

Падчас выступлення гучалі вершы не толькі з маіх вуснаў, але і з вуснаў маёй дачушкі – Валерыі Алізар. Яна, дарэчы, сама выклікалася выступіць, і мне было вельмі прыемна. Таксама ўдзел у мерапрыемстве прыняў мой сыночак Ягор Алізар. Ён паіграў на піяніна і тым самым дапоўніў літаратурны змест сустрэчы. У цэлым мерапрыемства прайшло выдатна і спадзяюся, што яно пакінула прыемныя пачуцці не толькі на тварах слухачоў, але і ў іх сэрцах. На доўгі ўспамін пра гэты дзень мы атрымалі ад бібліятэкі шыкоўны падарунак – кнігу “Копыльщина”. Яна зойме важкае месца на нашай хатняй палічцы ў Гродне.




Я шчыра дзякую кіраўніцтву бібліятэкі за магчымасць выступіць і за тую цеплыню, з якою сустракаліся мае радкі. Спадзяюся, што гэта была толькі першая сустрэча, і што ў хуткім часе мы сустрэнемся зноў. І завяршу свой артыкул словамі Анатоля Астрэйкі: “Я вершы, я песні пакіну народу свайму на ўспамін…”.

**Вольга АЛІЗАР**

**На здымках:** гродзенская паэтэса Вольга Алізар з дачкой і сынам выступіла ў Капыльскай раённай бібліятэцы імя А. Астрэйкі (Мінская вобласць). Ліпень 2025 года.


Радзіма мая-Капыль
Анатоль Астрэйка -
гонар і слава Нёманскага краю




Краіна якой ганаруся

